У. М. СТАРЧАНКА
Факультэт фізічнай культуры,
кафедра тэорыі і методыкі фізічнай культуры

# МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ФІЗКУЛЬТУРНА-СПАРТЫЎНАГА ПЕДАГОГА

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Даследванне прафесійнай культуры фізкультурна-спартыўнага педагога (ФСП) патрабуе распрацоўкі метадалогіі такой работы. Сэнс яе палягае ў распрацоўцы інтэлектуальнага інструментарыя даследчыка і агульнага праекта яго дзейнасці.

Галоўным інтэлектуальным інструментам даследчыка выступае анталагічная схема аб’екта даследвання. Гэтая схема з’яўляецца мадэллю-канфігуратарам і мусіць быць выкарыстана як сродак для распрацоўкі план-карты сістэмнага даследвання аб’екта.

Метадалогія даследвання прафесійнай культуры ФСП распрацавана намі ў межах дзейнаснага, сістэмнага і культуралагічнага падыходаў, спалучэнне якіх характэрна для сучаснай сістэма-дзейнаснай метадалогіі. У межах названай метадалогіі прафесійная культура можа быць прадстаўлена як спосаб ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці. У той час як прафесійная дзейнасць уяўляе сабой працэс матэрыялізацыі (рэалізацыі) прафесійных ідэй. Пры гэтым прафесійная дзейнасць як працэс матэрыялізацыі прафесійных ідэй ажыццяўляецца дзеячом (прафесіяналам) пры дапамозе прафесійнай культуры [1].

Такім чынам, прафесійная культура актуальна фарміруецца, існуе, развіваецца і ўцілізуецца толькі ў прафесійнай дзейнасці і з’яўляецца яе неад’емнай часткай. З другога боку прафесійная дзейнасць з’яўляецца кантэкстным і сістэмастваральным кампанентам прафесійнай культуры, бо апошняя без яе не існуе.

У межах сістэма-дзейнаснага і культуралагічнага падыходаў, намі была распрацавана тэарэтычная мадэль прафесійнай культуры ФСП [2]. Прафесійная культура ФСП ўключае ў сябе пяць узаемазвязаных элементаў: прафесійнае мысленне ФСП; патрэбасна-матывацыйна-каштоўнасную сферу (ПМЦС) яго прафесійнай культуры; прафесійныя веды; прафесійныя ўменні і навыкі; прафесійную фізічную падрыхтаванасць. Прычым названыя элементы аб’ядналы ў два ўзаемазвязаныя кампаненты прафесійнай культуры ФСП: ідэяльны і выканаўчы. Першы з іх забяспечвае мыслядзейнасць педагога, а другі – яго практычную дзейнасць. Менавіта здольнасць педагога ажыццяўляць мыслядзейнасць і практычную дзейнасць забяспечваюць яго здольнасць ажыццяўляць прафесійную дзейнасць, накіраваную на практычную рэалізацыю ідэй фізкультурна-спартыўнай педагогіцы. Трэба адзначыць, што прафесійная дзейнасць з’яўляецца асаблівым кантэкстным кампанентам прафесійнай культуры [2].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прад’яўленая тэарэтычная мадэль прафесійнай культуры ФСП з’яўляецца мадэлю-канфігуратарам дзейнасці даследчыка і выкарыстана намі ў якасці сродка для распрацоўкі план-карты сістэмнага даследвання аб’екта (Табліца 1).

Аднак да распарацоўкі метадалогіі даследвання прафесійнай культуры ФСП можна падыйсці і з другога боку. А менавіта з боку

прафесійнай дзейнасці, для чаго трэба выкарыстаць структурна-функцыянальную схему прафесійнай дзейнасці ФСП [1].

Табліца 1 – План-карта сістэмнага даследвання прафесійнай культуры ФСП

| Кампаненты прафесійнай культуры ФСП | Ідэяльны | | | Выканаўчы | | Кантэкстны |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Элементы прафесійнай культуры ФСП | Прафесійнае мысленне | Патрэбасна-матывацыйна-каштоўнасная сфера | Прафесійныя веды | Прафесійныя уменні і навыкі | Прафесійная фізічная падрыхтаванасць | Прафесійная дзейнасць |
| Тэарэтычныя задачы даследвання | Распрацаваць структурна-функцыянальную мадэль прафесійнага мыслення | Распрацаваць структуру і змест ПМЦС | Распрацаваць структуру і змест прафесійных ведаў | Распрацаваць структуру і змест прафесійных уменняў і навыкаў | Распрацаваць структуру і змест фізічнай падрыхтаванасці | Распрацаваць структурна-функцыянальную мадэль прафесійнай дзейнасці |
| Метадычныя задачы даследвання | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнага мыслення | Распрацаваць дыягностыку стану ПМЦС | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійных ведаў | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійных уменняў і навыкаў | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай фізічнай падрыхтаванасці | Распрацаваць дыягностыку параметраў прафесійнай дзейнасці |
| | Распрацаваць дыягностыку стану ідэяльнага кампанента прафесійнай культуры фізкультурна-спартыўнага педагога | | | Распрацаваць дыягностыку стану выканаўчага кампанента прафесійнай культуры фізкультурна-спартыўнага педагога | | |
| | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры фізкультурна-спартыўнага педагога | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Педагагічная дзейнасць найперш прадугледжвае дэманстрацыю педагогам узораў спосабаў дзейнасці, якія ён выкладвае ў педагагічную сітуацыю і якія падлягаюць капіраванню навучэнцамі. Узорамі спосабаў дзейнасці могуць выступаць узоры мыслення, ведаў, уменняў і навыкаў… Акрамя таго, педагог вядзе перманентны кантроль за вучэбнымі дасягненнямі і ўнутранымі ўмовамі педагагічнай дзейнасці з мэтай своечасовай і адэкватнай карэкціроўкі сваіх педагагічных уздзеянняў. Прычым педагог мусіць прымаць педагагічныя кіруючыя рашэнні на падставе пэўнай педагагічнай тэорыі, ўласнага вопыту і інтэлектуальных здольнасцяў.

Паколькі педагагічная сітуацыя залежыць ад педагагічных уздзеянняў педагога, то праз яе трансфармацыю ён імкнецца стварыць аптымальныя ўнутраныя ўмовы для паспяховай вучэбнай дзейнасці: арганізоўвае сістэму штучных квазівучэбных матываў вучэбнай дзейнасці, прадстаўляе яе вучэбна-метадычнае забеспячэнне…

Такім чынам мінімальна можна вылучыць тры кампаненты прафесійнай дзейнасці ФСП: педагагічныя ўздзеянні (дэманстрацыя ўзораў дзейнасці, стварэнне ўмоў вучэбнай дзейнасці), педагагічны кантроль (за вучэбнымі дасягненнямі, за умовамі вучэбнай дзейнасці), прыняццё рашэнняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прад’яўленая тэарэтычная схема прафесійнай дзейнасці ФСП таксама з’яўляецца мадэлю-канфігуратарам дзейнасці даследчыка прафесійнай культуры і можа быць выкарыстана ў якасці сродка для распрацоўкі план-карты сістэмнага даследвання аб’екта (Табліца 2).

Табліца 2 – План-карта сістэмнага даследвання прафесійнай культуры фізкультурна-спартыўнага педагога праз прызму прафесійнай дзейнасці

| Кампаненты прафесійнай дзейнасці ФСП | Педагагічныя ўздзеянні | | Педагагічны кантроль | | Прыняццё рашэнняў |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | | 3 | | 4 |
| Элементы прафесій-най дзейнасці ФСП | Дэманстра цыя ўзораў дзейнасці | Стварэнне ўмоў вучэбнай дзейнасці | Кантроль за вучэбны-мі дасягнен нямі | Кантроль за ўмовамі вучэбнай дзейнасці | |

Канчатак табліцы 2

| 1 | 2 | | 3 | | 4 |
|---|---|---|---|---|---|
| Тэарэтычныя задачы даследавання | Распрацаваць тэарэтычную мадэль культуры дэманстрацыі ўзораў дзейнасці | Распрацаваць тэарэтычную мадэль культуры стварэння ўмоў вучэбнай дзейнасці | Распрацаваць тэарэтычную мадэль культуры кантроля за вучэбнымі дасягненнямі | Распрацаваць тэарэтычную мадэль культуры кантроля за ўмовамі вучэбнай дзейнасці | Распрацаваць тэарэтычную мадэль культуры прыняцця рашэнняў |
| Метадычныя задачы даследавання | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры дэманстрацыі ўзораў дзейнасці | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры стварэння ўмоў вучэбнай дзейнасці | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры кантроля за вучэбнымі дасягненнямі | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры кантроля за ўмовамі вучэбнай дзейнасці | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры прыняцця рашэнняў |
| | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры педагагічных уздзеянняў фізкультурна-спартыўнага педагога | | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры педагагічнага кантроля фізкультурна-спартыўнага педагога | | |
| | Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры фізкультурна-спартыўнага педагога | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Відавочна, што і адна і другая план-карта сістэмна суадносяцца і на іх падставе магчыма распрацаваць агульную план-карту сістэмнага даследвання прафесійнай культуры ФСП. Скарочаны варыянт агульнай план-карты сістэмнага даследвання прафесійнай культуры педагога прадстаўлены ў табліцы 3.

Табліца 3 – Скарочаны варыянт агульнай план-карты сістэмнага даследвання прафесійнай культуры педагога

<table>
<tr><th rowspan="2">Задачы даследвання</th><th colspan="4">Кампаненты прафесійнай культуры педагога</th></tr>
<tr><th>Ідэяльны</th><th>Выканаўчы</th><th colspan="2">Кантэкстны</th></tr>
<tr><td>Тэарэтычныя задачы даследвання</td><td>Распрацаваць тэарэтычную мадэль ідэяльнага кампанента культуры дэманстрацыі ўзораў дзейнасці</td><td>Распрацаваць тэарэтычную мадэль выканаўчага кампанента культуры дэманстрацыі ўзораў дзейнасці</td><td rowspan="2">Педагагічныя ўздзеянні</td><td rowspan="6">Кампаненты прафесійнай дзейнасці педагога</td></tr>
<tr><td>Метадычныя задачы даследвання</td><td>Распрацаваць дыягностыку стану ідэяльнага кампанента культуры дэманстрацыі ўзораў дзейнасці</td><td>Распрацаваць дыягностыку стану ідэяльнага кампанента культуры дэманстрацыі ўзораў дзейнасці</td></tr>
<tr><td>Тэарэтычныя задачы даследвання</td><td>Распрацаваць тэарэтычную мадэль ідэяльнага кампанента культуры педагагічнага кантроля</td><td>Распрацаваць тэарэтычную мадэль выканаўчага кампанента культуры педагагічнага кантроля</td><td rowspan="2">Педагагічны кантроль</td></tr>
<tr><td>Метадычныя задачы даследвання</td><td>Распрацаваць дыягностыку стану ідэяльнага кампанента культуры педагагічнага кантроля</td><td>Распрацаваць дыягностыку стану выканаўчага кампанента культуры педагагічнага кантроля</td></tr>
<tr><td>Тэарэтычныя задачы даследвання</td><td>Распрацаваць тэарэтычную мадэль ідэяльнага кампанента культуры прыняцця рашэнняў</td><td>Распрацаваць тэарэтычную мадэль выканаўчага кампанента культуры прыняцця рашэнняў</td><td rowspan="2">Прыняццё рашэнняў</td></tr>
<tr><td>Метадычныя задачы даследвання</td><td>Распрацаваць дыягностыку стану ідэяльнага кампанента культуры прыняцця рашэнняў</td><td>Распрацаваць дыягностыку стану выканаўчага кампанента культуры прыняцця рашэнняў</td></tr>
<tr><td>Метадычная задача даследвання</td><td colspan="4">Распрацаваць дыягностыку стану прафесійнай культуры педагога</td></tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Распрацаваныя намі план-карты дазваляюць арганізаваць сістэмную нвуковую дзейнасць па даследванню прафесійнай культуры педагога.

## Літаратура

1 Старчанка, У. М. Тэарэтычная мадэль вучэбнай дзейнасці ў кантэксце педагагічнай дзейнасці / В. Н. Старченко // Современное образование: пути оптимизации качества в условиях развития школы : материалы респ.

науч.-практич. конф., Гомель, 5 мая 2010 г. : в 5 ч. / ГУО “ГОИРО” ; ред. кол. : А. В. Портнова [и др.]. – Гомель, 2010. – Ч. 5. – С. 24–29.

2 Старчанка, У. М. Структура і змест прафесійнай культуры спартыўнага педагога / Управление развитием образования в русле акмеологии : материалы Международной научно-практической конференции / редкол. : Н.В. Кухарев (отв. ред.) [и др.] ; М-во образования РБ, ГУО “ГОИРО” . – Гомель : ГУО “ГОИРО”, 2009. – Вып. XI, – Ч. 4. С. 44–47.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ